# Заклік

Пяць мільёнаў еўрапеек і еўрапейцаў
разам узвысяць голас:

## Супраць нацыяналізму
## За аб’яднаную Еўропу

## Субота
## 13 кастрычніка 2018 года

Мы хочам, каб Еўропа была прасторай свабоды і міру. А замест гэтага сёння зноў гучаць галасы ў абарону нацыяналізму. Пашыраецца нецярпімасць. Нянавісць робіцца ўсё больш галоснай, а гвалт — усё больш будзённым. Страх перад Іншым, Чужым падаграваюць і ператвараюць у палітычны капітал. Раздаецца покліч: дайце нам моцную руку! Карупцыя падточвае грамадствы. Прававая дзяржава разбураецца. Сацыяльныя дасягненні і з вялікімі высілкамі здабытыя правы апынуліся пад пагрозай. Свабода і мір перасталі быць натуральнымі рэчамі.

**Настае час заявіць пра сябе!**

У суботу, 13 кастрычніка, мы хочам вывесці на вуліцы і плошчы пяць мільёнаў еўрапеек і еўрапейцаў, якія разам узвысяць голас супраць нацыяналізму за аб’яднаную, дэмакратычную і салідарную Еўропу.

**Арганізуйцеся**!

Правядзіце ў суботу, 13 кастрычніка, а 14 гадзіне па цэнтральнаеўрапейскім часе мітынгі па ўсіх гарадах Еўропы — не толькі ў краінах Еўрапейскага саюза. Гуртуймася: прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці, грамадскія аб’яднанні, рэлігійныя суполкі, недзяржаўныя арганізацыі, людзі культуры, грамадзяне… Нас шмат!
Давайце прадэманструем гэта 13 кастрычніка! Гучна і ясна!

Атрымаць актуальную інфармацыю можна тут:

**www.13-10.org**

Тыя з вас, хто хоча сам арганізаваць мітынг або актыўна паспрыяць яго правядзенню ў сваім горадзе, атрымаюць неабходную інфармацыю тут: www.13-10.org

Мы, ініцыятары, створым сайт (www.13-10.org), дзе на мапе Еўропы будуць пазначаны ўсе мерапрыемствы 13 кастрычніка са спасылкамі на нацыянальных арганізатараў. Мы будзем каардынаваць кампанію ў сацыяльных медыя і прапануем у інтэрнэце шаблоны для аднастайнага графічнага афармлення і макеты для рэкламных матэрыялаў, флаераў і ўлётак.